ДЫЯЛОГ ПАКАЛЕННЯЎ 4





НЕ ПАСЛІЗНІЦЕСЯ НА ВЫХАДНЫХ 16

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

6 СНЕЖНЯ 2024 г. ПЯТНІЦА № 238 (30372)

З першых вуснаў

# «ЁСЦЬ ПЫТАННІ, ДА ЯКІХ У НАС АСАБЛІВАЯ ЎВАГА І ВЯЛІКІ ІНТАРЭС»

## Па выніках года чакаецца рэкордны ўзровень аб'ёму гандлю з Расіяй

**Парадак дня пасяджэння Вышэйшага дзяржсавета Саюзнай дзяржавы і падрыхтоўку да яго разгледзелі ў Палацы Незалежнасці. Найперш адбылася сустрэча Аляксандра Лукашэнкі з Дзяржаўным сакратаром Саюзнай дзяржавы Дзмітрыем Мезенцавым, падчас якой быў абмеркаваны парадак дня пасяджэння Вышэйшага дзяржсавета, якое пройдзе ў Мінску 6 снежня пад старшынством Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Старшыні Вышэйшага дзяржсавета. Падрыхтоўцы да гэтага найважнейшага мерапрыемства затым была прысвечана спецыяльная нарада.**





Фота БелТА.

На пасяджэнні Вышэйшага дзяржсавета, якое, дарэчы, пройдзе напярэдадні 25-годдзя з дня падпісання Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, плануецца разгледзець ход выканання Асноўных кірункаў рэалізацыі палажэнняў Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы на 2024—2026 гады, падрыхтаваную Канцэпцыю бяспекі Саюзнай дзяржавы. Акрамя таго, парадак дня маючага адбыцца пасяджэння Вышэйшага дзяржсавета ўключае пытанні, якія датычацца лічбавізацыі, энергетыкі, абароны правоў спажыўцоў, сувязі і інфарматызацыі, стварэння аб'яднанага рынку электраэнергіі.

Таксама ўдзельнікі пасяджэння разгледзяць пытанне аб арганізацыі і правядзенні мерапрыемстваў па святкаванні 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

СТАР. 2

### КОРАТКА

- ЕАБР: тэмпы росту эканомікі Беларусі ў 2025 годзе застануцца на павышаным узроўні.
- **Урок памяці аб лёсах дзяцей вайны пройдзе ў Красным Беразе 7 снежня.**
- Крэдыты Беларусбанка на нерухомасць у невялікіх населеных пунктах цяпер пад 12,5 працэнта гадавых.
- **Акадэмія нацыянальнай бяспекі зможа набіраць студэнтаў па грамадзянскіх спецыяльнасцях.**

Па сутнасці справы

# ХОРАША ТАМ, ДЗЕ МОЛАДЗЬ ЁСЦЬ!

На дзяржаўным узроўні пастаянна прымаюцца меры, накіраваныя на павышэнне прэстыжу сельскагаспадарчых спецыяльнасцяў

**Работа па прыцягненні маладых спецыялістаў у АПК Беларусі на самай справе вядзецца без перапынку. На сустрэчы ў Полацку з працаўнікамі вёскі кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: «Сяло павінна ісці ў нагу з часам. Нам трэба вярнуць у вёску моладзь і далучыць яе да вырашэння інавацыйных задач, ствараць умовы для гэтага і даваць магчымасць праявіць сябе».**

**Працэсы мадэрнізацыі, укаранення прынцыпова новых тэхналагічных спосабаў вытворчасці, якія адбываюцца сёння ў сельскай гаспадарцы, і сапраўды патрабуюць кадраў, якія здольныя рэалізаваць маштабныя пераўтварэнні. Па словах спецыялістаў Мінсельгасхарча, сённяшняя сістэма падрыхтоўкі кадраў для прадпрыемстваў аграрнага комплексу (нагадаем, у краіне спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй рыхтуюць чатыры аграрныя ВНУ, з сярэдняй спецыяльнай — 37 каледжаў, кадры рабочых прафесій рыхтуюць 64 прафесійна-тэхнічныя каледжы) цалкам адпавядае ўсім сучасным патрабаванням і дазваляе штогод накіроўваць у АПК краіны каля шасці тысяч спецыялістаў. На месцах для павышэння прэстыжу працы і матывацыі пражывання для іх ужо шмат зроблена і шмат што робіцца. Але, згадзіцеся, нямала залежыць і ад моладзі...**

СТАР. 13

ISSN 1990 — 763X

24238>

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Ідзе падпіска на І квартал і І паўгоддзе 2025 года.

Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2025 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



# «ЁСЦЬ ПЫТАННІ, ДА ЯКІХ У НАС АСАБЛІВАЯ ЎВАГА І ВЯЛІКІ ІНТАРЭС»



**Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што, нягледзячы на ўсе праблемы і рознага роду нявырашаныя пытанні, сёлета гандлёвы абарот паміж Беларуссю і Расіяй дасягне 59—60 мільярдаў долараў, уключаючы тавары і паслугі. Як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, гэта гістарычна высокі тавараабарот паміж дзвюма дзяржавамі.**

## «Фундаментам любых адносін з'яўляецца эканоміка»

«25 гадоў мы спрабуем стварыць Саюзную дзяржаву, — адзначыў у размове з Дзмітрыем Мезенцавым Прэзідэнт Беларусі. — Многія кірункі былі вызначаны. Штосьці часова не зрабілі, але нямала зроблена. Натуральна, што без размовы на гэту тэму заўтра на Вышэйшым дзяржсавеце кіраўніцтва Расіі і Беларусі мы не абыдземся. Пэўным чынам мы гэтую праблему будзем адзначаць».

Аляксандр Лукашэнка папрасіў Дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы больш падрабязна далажыць аб парадку дня маючага адбыцца пасяджэння Вышэйшага дзяржаўнага савета. «Мы яшчэ абмяркуем з беларускімі міністрамі нюансы, калі яны будуць, але хацелася б ведаць, якія пытанні і ці ёсць нейкія праблемы па парадку дня», — удакладніў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што напярэдадні ў яго адбылася размова з Уладзімірам Пуціным, падчас якой, па словах кіраўніка дзяржавы, абмяркоўваліся шматлікія пытанні. «Я яшчэ раз яго запрасіў у Мінск і сказаў, што мы падрыхтуем як належыць з вамі пасяджэнне Вышэйшага дзяржаўнага савета, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Таму трэба прайсціся яшчэ раз па парадку дня і ўдакладніць некаторыя пытанні коратка, хаця яны ўжо вызначаны».

Кажучы аб сумеснай дзейнасці ў рамках Саюзнай дзяржавы, беларускі лідар яшчэ раз акцэнтаваў увагу на тым, што нямала зроблена. «Асабліва ў галіне правоў чалавека, роўных правоў нашых грамадзян — Расіі і Беларусі, — канкрэтызаваў ён. — Але, думаю, трэба нам дзесьці смялей ісці ў гэтым кірунку. І, вядома, Дзмітрый Фёдаравіч, фундаментам (вы гэта ведаеце не горш за мяне) любых адносін з'яўляецца эканоміка. У нас ёсць шэраг пытанняў фундаментальных, якія мы павінны, напэўна, ужо ў будучым годзе вырашыць разам з Расіяй. Маючы на ўвазе, што многае ўжо зроблена ў гэтым кірунку, прапрацаваны гэтыя пытанні. Трэба прымаць рашэнні».

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка ўдакладніў, што калі рашэнні прынятыя, то трэба іх выконваць аператыўна. «Ніякай бюракратычнай валакіты быць не павінна, — папярэдзіў кіраўнік дзяржавы. — Ну і потым, калі прынялі рашэнні, непаразуменняў ніякіх не павінна быць». Па словах Прэзідэнта, падобныя пытанні будуць абмеркаваны з яго расійскім калегам на Вышэйшым дзяржсавеце.



Рэзюмуючы, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што парадак дня маючага адбыцца мерапрыемства шырокі, пытанні падрыхтаваны. «Але, магчыма, ёсць нейкія нюансы, таму давайце абмяркуем іх», — прапанаваў ён.

У сваю чаргу Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў пагадзіўся з беларускім лідарам, што акцэнт у саюзным будаўніцтве павінен рабіцца на ўзаемавыгадным узаемадзеянні ў сферы эканомікі. «Дзякуючы пазіцыі вашай асабіста, Уладзіміра Уладзіміравіча Пуціна цяпер у кампетэнцыі ўрадаў — парадак дня па гуманітарным кірунку: адукацыя, культура, спорт, усё большая ўвага ўдзяляецца турыстычным кластарам, — канкрэтызаваў ён. — Але пры гэтым, вядома (вы цяпер таксама сказалі аб гэтым), змястоўны парадак дня складаецца з дзесяці пытанняў. Прынцыпова ўсе пытанні вельмі старанна прапрацаваны. Парадак дня сапраўды шматпланавы, узгоднены бакамі. Мы, вядома, хочам, каб частка пытанняў была праведзена з абмеркаваннем, каб выказаліся бакі».

## «Усё павінна быць адкрыта, ніякага замоўчвання быць не павінна»

**«Як вядома, 25 гадоў спаўняецца нашым спробам пабудаваць Саюзную дзяржаву, — канстатаваў ужо падчас нарады па пытаннях падрыхтоўкі да пасяджэння Вышэйшага дзяржсавета Аляксандр Лукашэнка.** — Я ўжо пра гэта сказаў на сустрэчы з Дзмітрыем Фёдаравічам Мезенцавым. Толькі што мы абмеркавалі парадак дня заўтрашняга пасяджэння Вышэйшага дзяржаўнага савета ў агульных рысах. І канцэптуальныя рэчы абазначылі па ўсіх нашых праблемах, але вас я запрасіў перш за ўсё таму, каб пачуць вашу пазіцыю па выкананні нашых інтарэсаў. І не толькі на заўтрашнім пасяджэнні ВДС, але і ў беларуска-расійскіх адносінах. Канкрэтна. Якія ёсць пытанні ў сферы эканомікі, нацыянальнай бяспецы, па іншых праблемах. І, у прыватнасці, па тых пытаннях, якія заўтра будуць разглядацца на агульным пасяджэнні».

Прэзідэнт адзначыў, што на пасяджэнні Вышэйшага дзяржаўнага савета ў Мінску будзе прысутнічаць усё кіраўніцтва Расійскай Федэрацыі. «Гэта той выпадак, калі мы можам і павінны абмеркаваць праблемы, якія ў нашых адносінах існуюць, — падкрэсліў ён. — Ёсць праблемы, якія павінны быць вырашаны на гэтым этапе».

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што, нягледзячы на ўсе праблемы і рознага роду нявырашаныя пытанні, сёлета гандлёвы абарот паміж Беларуссю і Расіяй дасягне 59—60 мільярдаў долараў, уключаючы тавары і паслугі. Як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, гэта гістарычна высокі тавараабарот паміж дзвюма дзяржавамі.

«Але, яшчэ раз кажу, ёсць пытанні, да якіх у нас асаблівая ўвага і вялікі інтарэс», — удакладніў Прэзідэнт і папрасіў удзельнікаў нарады далажыць па пытаннях, уключаных у парадак дня пасяджэння Вышэйшага дзяржаўнага савета, якія не вырашаюцца. «Усё павінна быць адкрыта, ніякага замоўчвання быць не павінна, — акцэнтаваў увагу беларускі лідар. — Не толькі на ВДС, тым больш на нашай нарадзе».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

● У тэму

# Што будзе на парадку дня Вышэйшага дзяржсавета

Як расказаў у размове з журналістамі **Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ, парадак дня пасяджэння Вышэйшага дзяржсавета ўключае 10 змястоўных пытанняў, даклады ўрадаў аб інтэграцыйнай рабоце і характарыстыках, якія адрозніваюць двухбаковае гандлёвае супрацоўніцтва, што дынамічна пашыраецца. Будзе разгледжана і Канцэпцыя бяспекі Саюзнай дзяржавы, якая, па словах Дзяржсакратара, з'яўляецца найважнейшым, актуальным дакументам.**

«Ідзе, на жаль, ускладненне ваенна-палітычнай абстаноўкі ва ўсходне-еўрапейскім рэгіёне, на Беларусь і Расію нарастае ціск (інфармацыйны, ваенна-палітычны), гучаць пагрозы, — канстатаваў Дзмітрый Мезенцаў. — І, самае галоўнае, Захад не можа прымірыцца з тым, што афіцыйныя Мінск і Масква праводзяць узгодненую палітыку па дзясятках напрамкаў і не згаджаюцца з мадэллю аднапалярнага свету, калі трэба прысягаць, падладжвацца, прыніжацца перад нейкім заакіянскім абкамам або адной са сталіц у Заходняй Еўропе. Гэта недапушчальна, бо гэта перш за ўсё не адпавядае інтарэсам дзясяткаў і дзясяткаў мільёнаў грамадзян Беларусі і Расіі».

На пасяджэнні Вышэйшага дзяржсавета плануецца зацвердзіць і Дагавор аб фарміраванні аб'яднанага рынку электраэнергіі Саюзнай дзяржавы. «Гэта і вынік уводу ў строй Беларускай атамнай станцыі, фарміраванне той сістэмы адносін, якая грунтуецца на падмурку большага даверу, таварыства, сапраўды раўнапраўнага ўліку інтарэсаў адзін аднаго», — адзначыў ён.

Дагавор аб фарміраванні аб'яднанага рынку электраэнергіі Саюзнай дзяржавы дасць магчымасць знізіць да мінімуму страты ў энергасетках, збалансаваць тарыфы, забяспечыць узаемны ператок энергіі дзеля людзей, дзеля папаўнення бюджэтаў. Пры гэтым Дзмітрый Мезенцаў дапускае, што не выключаны і пэўныя спрэчкі ў міждзяржаўных адносінах, як пакупнік заўсёды спрачаецца з прадаўцом або як спрачаюцца гаспадарчыя суб'екты. «Але ў мадэлі сістэмы адносін — гэта тое, што неабходна для таго, каб мы дасягалі відавочных вынікаў. А яны, безумоўна, ёсць», — акцэнтаваў увагу ён.

Адным з пытанняў у парадку дня пасяджэння Вышэйшага дзяржаўнага савета стане ўвядзенне адзіных правілаў абароны правоў спажыўцоў. Адпаведнае пагадненне падрыхтавана Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Беларусі і Расспажыўнаглядам. Па словах Дзмітрыя Мезенцава, гэты дакумент дазволіць мільёнам грамадзян быць больш абароненымі ў сістэме адносін з прадаўцом, вытворцам, пасрэднікам, пастаўшчыком. «Гэта прарыўное рашэнне, яно па-сапраўднаму значнае і знакавае», — падкрэсліў дзяржсакратар.




**На разгляд удзельнікаў пасяджэння Вышэйшага дзяржсавета таксама будзе ўнесены план падрыхтоўкі да святкавання 80-годдзя Вялікай Перамогі.**

«Тое, што два нацыянальныя лідары, Уладзімір Уладзіміравіч Пуцін і Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, нязменна, паслядоўна паказваюць свету адзіную пазіцыю павагі да подзвігу савецкага народа — гэта ні для каго не сакрэт, — канстатаваў Дзмітрый Мезенцаў. — Гэта сігнал усім нам — шанаваць і памятаць».

У плане, па яго словах, 48 пазіцый. Фінансаванне плана ідзе з саюзнага, рэспубліканскага і федэральнага бюджэтаў. Дзяржсакратар расказаў, што прэзідэнты падтрымалі ініцыятыву аб заснаванні прэміі Саюзнай дзяржавы за ўклад у абарону гістарычнай памяці, а таксама прапанову Савета Парламенцкага сходу аб вылучэнні 100 мільёнаў рублёў з саюзнага бюджэту на музеефікацыю мемарыяльнага комплексу на Буйніцкім полі ў Магілёўскай вобласці.

Дзмітрый Мезенцаў адзначыў, што за 25 гадоў у фармаце Саюзнай дзяржавы было прынята 1455 рашэнняў: 308 — гэта рашэнні Вышэйшага дзяржсавета, 1147 — рашэнні Савета Міністраў. Ён паведаміў, што сёлета Беларусь і Расія зацвердзілі 31 план мерапрыемстваў па выкананні асноўных кірункаў рэалізацыі палажэнняў Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы на 2024—2026 гады. Планы ўключаюць звыш 300 задач, і адна шостая частка з іх ужо выканана. «Патэнцыял Саюзнай дзяржавы вялікі, не вычарпаны, гэта аснова для таго, каб мы рухаліся далей», — рэзюмаваў Дзмітрый Мезенцаў.

Блізкая ўлада

# Члены Савета Рэспублікі правядуць адзіны дзень прыёму грамадзян у кожным раёне Мінска 10 снежня

Прыёмы правядуць:

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь **КАЧАНАВА Наталля Іванаўна** — з 10.00 у дзяржаўным прадпрыемстве «ЖЭУ нумар 4 Цэнтральнага раёна г. Мінска» (пр. Пераможцаў, 83, прыём — па папярэднім запісе);

намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь **ХАМЕНКА Сяргей Мікалаевіч** — з 10.00 у камунальным унітарным прадпрыемстве «ЖЭУ нумар 4 Ленінскага раёна г. Мінска» (вул. Янкі Лучыны, 14);

старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы **АЛЕЙНІК Сяргей Фёдаравіч** — з 10.00 у камунальным унітарным прадпрыемстве «ЖЭУ нумар 3 Партызанскага раёна г. Мінска» (вул. Стаханаўская, 27);

старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні **ЗАЯЦ Леанід Канстанцінавіч** — з 10.00 у камунальным унітарным прадпрыемстве «ЖЭУ нумар 1 Кастрычніцкага раёна г. Мінска» (вул. Варанянскага, 11/1);

старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве **РУСЫ Міхаіл Іванавіч** — з 10.00 у дзяржаўным прадпрыемстве «ЖЭУ нумар 3 Цэнтральнага раёна г. Мінска» (вул. Арлоўская, 24);

старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці **СІВЕЦ Сяргей Міхайлавіч** — з 10.00 у дзяржаўным прадпрыемстве «ЖЭУ нумар 4 Савецкага раёна г. Мінска» (вул. Леаніда Бяды, 11/1);

старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па эканоміцы, бюджэце і фінансах **ТАТАРЫНОВІЧ Уладзіслаў Вікенцьевіч** — з 10.00 у дзяржаўным прадпрыемстве «ЖЭУ нумар 4 Маскоўскага раёна г. Мінска» (пр. Газеты «Звязда», 18);

намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы **ЖУК Дзмітрый Аляксандравіч** — з 10.00 у дзяржаўным прадпрыемстве «ЖЭУ нумар 9 Фрунзенскага раёна г. Мінска» (вул. Лідская, 22);

член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці **ІЛЬІНА Марына Аляксандраўна** — з 10.00 у камунальным унітарным прадпрыемстве «ЖЭУ нумар 4 Партызанскага раёна г. Мінска» (вул. Сувязістаў, 6);

член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці **КАНДРАТОВІЧ Віктар Аляксандравіч** — з 10.00 у дзяржаўным прадпрыемстве «ЖЭУ нумар 1 Заводскага раёна г. Мінска» (вул. Я. Райніса, 9);

член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы **РУМО Алег Алегавіч** — з 10.00 у камунальным унітарным прадпрыемстве «ЖЭУ нумар 6 Першамайскага раёна г. Мінска» (вул. Шугаева, 19, корп. 3).

*Задача ад Першага*

***«У нас бліскучыя дыпламатычныя адносіны. Мы аднолькава бачым міжнародны парадак дня. Але мы значна адстаём у гандлёва-эканамічных адносінах ад тых магчымасцяў, якія існуюць паміж нашымі краінамі. Таму нам абавязкова патрэбна нашы палітычныя адносіны манетызаваць. Трэба паглыбіць і развіць гандлёва-эканамічныя адносіны.»***

*Аляксандр Лукашэнка падчас афіцыйнага візіту ў Пакістан.*
26 лістапада 2024 года.

# ЧАС ДЗЕЙНІЧАЦЬ НА ВЫНІК

## Рэктар РІПА — аб узаемадзеянні з Пакістанам і задачах, пастаўленых Прэзідэнтам

**На мінулым тыдні кіраўнік дзяржавы ажыццявіў афіцыйны візіт у Пакістан. Склад беларускай афіцыйнай і бізнес-дэлегацый у Ісламабадзе і дасягнутыя дамоўленасці, падпісаныя пагадненні і кантракты сведчаць аб узаемным жаданні бакоў развіваць супрацоўніцтва па ўсіх кірунках. Рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Валерый ГАЛУБОЎСКІ, які браў удзел у гэтым візіце, расказаў аб дасягнутых з пакістанскім бокам дамоўленасцях і чаканнях ад наладжвання кантактаў.**

— У склад дэлегацыі быў уключаны, таму што ўзначальваю інстытут, які каардынуе падрыхтоўку кадраў з прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, а пакістанскі бок зацікаўлены ў развіцці гэтай сферы і падрыхтоўцы рабочых кадраў. І каледжы, і педагогі, якія працуюць у каледжах, патрабуюць адпаведнага навучання і садзейнічання ў распрацоўцы зместу праграм падрыхтоўкі, — расказаў суразмоўнік.

Паводле яго слоў, гаворка можа ісці аб стварэнні цэнтраў кампетэнцый на тэрыторыі Пакістана, якія сталі б месцам падрыхтоўкі рабочых кадраў з ліку моладзі і дарослых.

— Падчас паездкі мы падпісалі мемарандум паміж РІПА і Нацыянальнай камісіяй па прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Прадметам пагаднення з'яўляецца садзейнічанне з боку РІПА ў павышэнні кваліфікацыі выкладчыкаў і майстроў, садзейнічанне ў стварэнні Цэнтра кампетэнцый у сферы энергетыкі. Пры зацікаўленасці пакістанскага боку, магчыма, і па іншых профілях. Напрыклад, абмяркоўвалі профіль эксплуатацыі і абслугоўвання сельскагаспадарчай тэхнікі, паколькі Мінскі трактарны завод пастаўляе туды сваю прадукцыю. Адпаведна, працоўныя кадры па гэтым кірунку таксама патрэбныя.

Валерый Галубоўскі адзначыў той факт, што Пакістан не так даўно ўвайшоў у склад удзельнікаў міжнароднага чэмпіянату прафесійнага майстэрства WorldSkills International і ўпершыню прыняў удзел у кастрычніку 2024 года ў чарговым чэмпіянаце ў Ліёне (Францыя).

Улічваючы вопыт РІПА, як нацыянальнага аператара конкурсаў прафесійнага майстэрства па рабочых прафесіях, беларускі бок запрасіў калег паўдзельнічаць у рэспубліканскім конкурсе прафесійнага майстэрства Profskills, які пройдзе ў маі 2025-га:

— Мы запрашаем пакістанскі бок, каб канкурсанты паўдзельнічалі ў спаборніцтвах, а кіраўнікі каледжаў і універсітэтаў у мерапрыемствах, дзелавой праграме, паглядзелі нашу сістэму навучання, азнаёміліся з нашымі каледжамі, каб у канчатковым выніку выйсці на канкрэтныя прафесіі, у дапамозе па падрыхтоўцы якіх яны маюць патрэбу.

— Не чакаючы майскага чэмпіянату, у хуткім часе чакаем прадстаўнікоў пакістанскага боку з візітам у Мінск, будзем далей выбудоўваць план мерапрыемстваў па кожным з пунктаў мемарандума, а менавіта: якія мэтавыя групы могуць прыехаць на навучанне, па якіх прафесіях або асобных кампетэнцыях, у якія тэрміны і г. д. Выходзячы з гэтага, трэба планаваць 2025 год, — растлумачыў рэктар РІПА.

Наколькі рэзультатыўнымі будуць дамоўленасці? Суразмоўнік не сумняваецца, што ўжо ў бліжэйшай перспектыве яны будуць мець канкрэтнае ўвасабленне:

— Каб разам з заказчыкамі кадраў з бізнес-місіі мы пасля іх візіту падрыхтавалі пэўныя прапановы па праграмах у разрэзе прафесій.

Варта сказаць, што досвед у Беларусі па стварэнні падобных цэнтраў кампетэнцый у іншых краінах ёсць.

— Мы дапамагалі (кансультацыйна і метадычна) у навучанні майстроў-выкладчыкаў у Казахстана. Там у 2014 годзе з нашай дапамогай створана 14 цэнтраў. Цяпер праект рэалізоўваем з Узбекістанам і Азербайджанам, — пракаментаваў Валерый Галубоўскі.

Ацэньваючы перспектывы дасягнутых падчас візіту афіцыйнай дэлегацыі дамоўленасцяў, суразмоўнік выказаў упэўненасць, што іх рэалізацыя не прымусіць доўга сябе чакаць:

— Калі візіт праходзіць на ўзроўні кіраўніка дзяржавы, вядома, значнасць такіх сустрэч кратна ўзмацняецца з боку партнёраў, у дадзеным выпадку з боку Пакістана. Адпаведна, выбудоўваецца больш сістэмная работа па ўсіх каналах, міністэрствах, падведамасных структурах, як наша. Беларускі бок, ва ўсякім выпадку, вельмі адказна ў гэтых працэсах падыходзіць і гатовы дзейнічаць хутка.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

Пераемнасць пакаленняў

# «ВЫ СЁННЯ МОЖАЦЕ ЗРАБІЦЬ УСЁ, КАБ МЫ МАГЛІ ЗАХАВАЦЬ СВАЮ КРАІНУ»

## Маладыя дзяржслужачыя сабраліся ў Мінску, каб абмяняцца досведам і новымі ідэямі



Фота БелТА.

**Два дні ў сталіцы працаваў II Форум маладых дзяржаўных служачых, які сабраў больш за 250 маладых людзей з усёй Беларусі і нават іншых краін.**

Ранкам чацвярга ўдзельнікі форуму з экскурсіяй наведалі Савет Рэспублікі, дзе даведаліся пра дзейнасць парламентарыяў сёння і ўвогуле пра развіццё беларускага парламентарызму. З маладымі калегамі сустрэўся старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Сяргей Сівец.

Скончыўся форум пленарным пасяджэннем, дзе найважнейшыя тэмы з маладымі дзяржслужачымі абмяркавала Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава. Яна вельмі рада таму, што ініцыятыва правядзення форуму належыць непасрэдна маладым людзям. Па яе словах, гэта выдатна. «І вельмі выдатна, што вы пашырылі свае рамкі і тут прысутнічаюць вашы калегі, які працуюць на дзяржаўнай службе ў іншых гарадах», — падкрэсліла Наталля Качанава. Яна зрабіла акцэнт на тым, што ў Беларусі ўсё робіцца для народа і ўлада ў нас народная. Спікер дала маладым калегам і першую параду: «Людзі, якія выбралі для сябе службу дзяржаве, павінны рабіць усё, каб дзяржава развівалася. Каб дзяржава, якая яшчэ нядаўна атрымала суверэнітэт і незалежнасць, была такой жа суверэннай і незалежнай краінай, дзе жывуць шчаслівыя людзі».

Асобна Наталля Качанава звярнула ўвагу, што адзін з асноўных кірункаў сацыяльнай палітыкі Беларусі — работа з моладдзю. «Зроблена многае. Але яшчэ трэба шмат чаго зрабіць, у тым ліку і вам. Час, які выбраў вас, няпросты», — падкрэсліла яна.

Па словах спікера, змена пакаленняў пройдзе хутка і ў найбліжэйшы час найважнейшыя для краіны рашэнні ў розных ведамствах і дзяржаўных органах будуць прымаць удзельнікі форуму і іх калегі. «Вы павінны ведаць залатое правіла работы ў дзяржслужбе: гэта не работа. І калі вы робіце для сябе гэты выбар, вы павінны разумець, што гэта служба, як ваенная служба, толькі служба для дзяржавы ў дзяржаўных органах», — зрабіла акцэнт Наталля Качанава. Вельмі важным для дзяржслужачых яна назвала здольнасць прымаць рашэнні і несці за іх адказнасць. «І яшчэ вельмі важнае ўменне любіць людзей», — дадала Старшыня Савета Рэспублікі.

Падчас размовы маладыя людзі не саромеліся прасіць парады. У прыватнасці, ішла гаворка пра ўзаемадзеянне з прэс-службай па пытаннях інфармацыйнай бяспекі ў цэлым. «Сёння гэта галоўнае ў нашай рабоце, у рабоце любога дзяржаўнага органа. Так, як умеюць данесці праўду аб тым, чым займаецца дзяржаўны орган, так людзі і ўспрымаюць нас», — заўважыла спікер. Наталля Качанава падкрэсліла, што сёння роля прэс-службаў, інфармацыйна-аналітычных упраўленняў узрастае ў разы. Па яе словах, сёння вельмі цяжка арыентавацца ў патоку інфармацыі, таму даваць варта толькі афіцыйным крыніцам. «У мяне нядаўна студэнты спыталі, якія пагрозы для моладзі я бачу. І першае, што я сказала, — інфармацыйная», — адзначыла Наталля Качанава. Разбіралі і аспекты кадравай палітыкі. «Мы павінны з гонарам казаць пра тых людзей, якія ствараюць дабрабыт», — падкрэсліла спікер. Яна заўважыла, што за ўсімі звыклымі рэчамі стаіць праца многіх людзей і гэта трэба шанаваць. Маладыя дзяржаўныя служачыя разам з Наталляй Качанавай разгледзелі міжнародны парадак дня, патрыятычнае выхаванне моладзі і іншыя важныя надзённыя пытанні.

«Я б хацела падзякаваць тым, хто для сябе сёння выбраў працаваць у дзяржаўнай службе. А тым, хто калісьці прыме такое рашэнне, раю вельмі добра падумаць, але не баяцца гэтага, — сказала спікер на развітанне. — У вас яшчэ ўсё наперадзе. Вы толькі ў пачатку свайго шляху: цудоўнага, цікавага, выдатнага. Але вы сёння можаце зрабіць многае. Вы сёння можаце зрабіць усё, каб мы маглі захаваць сваю краіну. Мы павінны быць як ніколі адзінымі. Няважна, якога ты ўзросту: 18, 20, 30, 40, 70, 80 гадоў, — мы павінны зрабіць правільны выбар. Мы павінны зрабіць будучыню сваёй краіны такой, якая яна сёння ёсць: мірная, прыгожая краіна, накіраваная на развіццё і росквіт свайго народа, якая робіць усё для таго, каб людзям тут было камфортна».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Парламенцкі дзённік

# ПАЛЯПШЭННЕ ДАБРАБЫТУ І САЦЫЯЛЬНАЯ ПАДТРЫМКА

## Дэпутаты прынялі найважнейшыя фінансавыя дакументы краіны на 2025 год

**Сярод іх — рэспубліканскі бюджэт і змяненні ў Падатковы кодэкс, разгледжаныя ў другім чытанні. Бюджэтная палітыка ў будучым годзе будзе накіравана на забеспячэнне збалансаванасці рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, канцэнтрацыю бюджэтных сродкаў на кірунках, якія садзейнічаюць дасягненню стратэгічных мэт сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны.**



Фота БелТА.

### 48 % — на забеспячэнне дзяржаўных праграм

Традыцыйна захоўваецца сацыяльная арыентаванасць расходаў, у тым ліку за кошт рэалізацыі мер, накіраваных на павышэнне якасці жыцця насельніцтва, дабрабыту работнікаў бюджэтнай сферы, падтрымку шматдзетных сем'яў. Будуць забяспечаны ўсе абавязацельствы па пагашэнні дзяржаўнага доўгу з улікам раней выпрацаваных механізмаў па ўзаемадзеянні з недружалюбнымі краінамі.

Як адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Васіль ПАНАСЮК,** пры падрыхтоўцы законапраекта «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2025 год» да другога чытання істотных змяненняў па даходнай і расходнай частцы не адбылося. «Але разам з тым былі ўдакладняльныя моманты па даходнай частцы, — канкрэтызаваў ён. — Такім чынам, па даходах асноўную структуру займаюць падатак на дабаўленую вартасць, даходы ад знешнеэканамічнай дзейнасці, даходы ад акцызаў».

Па словах парламентарыя, істотных змен не зведала расходная частка бюджэту, захаваўшы сацыяльную накіраванасць. Васіль Панасюк звярнуў увагу, што сацыяльная накіраванасць абумоўлена тым, што больш як 48 % рэспубліканскага бюджэту накіравана на забеспячэнне дзяржаўных праграм.

«Калі казаць тэзісна, то на адукацыю — больш чым на 14 %, больш за два мільярды ў абсалютным выяўленні, — канкрэтызаваў ён. — На ахову здароўя — 12 %, або 2,7 мільярда. Рэалізацыя сацыяльнай палітыкі дзяржавы ўключае такія важкія кірункі, як стварэнне сямейнага капіталу. У наступным годзе прадугледжваем больш за 361 мільён рублёў на гэтыя мэты. На падтрымку будаўніцтва жылля з дзяржаўнай дапамогай — 1,9 мільярда. Дзяржаўная інвестпраграма — 1,4 мільярда».

Вялікае значэнне дэпутаты надалі напаўненню дарожнага фонду. «Акрамя транспартнага падатку, які мы збіраем у агульную суму з улікам фінансавых інтэрвенцый, з рэспубліканскага бюджэту на гэтыя мэты будзе накіравана больш за 2,1 мільярда рублёў», — канкрэтызаваў старшыня Пастаяннай камісіі.

> **«Калі казаць тэзісна, то на адукацыю — больш чым на 14 %, больш за два мільярды ў абсалютным выяўленні, — канкрэтызаваў ён. — На ахову здароўя — 12 %, або 2,7 мільярда. Рэалізацыя сацыяльнай палітыкі дзяржавы ўключае такія важкія кірункі, як стварэнне сямейнага капіталу. У наступным годзе прадугледжваем больш за 361 мільён рублёў на гэтыя мэты. На падтрымку будаўніцтва жылля з дзяржаўнай дапамогай — 1,9 мільярда. Дзяржаўная інвестпраграма — 1,4 мільярда».**

На падтрымку аграпрамысловага комплексу плануецца накіраваць больш за мільярд рублёў. «Падтрымка рэальнага сектара эканомікі — з плюсам 2,3 мільярда, — дадаў дэпутат. — У абсалюце інавацыйныя праграмныя праекты будуць прафінансаваны парадкам на 7,3 мільярда рублёў».

Васіль Панасюк звярнуў увагу на тое, што нават у няпростых санкцыйных міжнародных уздзеяннях на нашу эканоміку, пры такім прагматычным рэалістычным бюджэце, дзе гарманічна спалучаюцца палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя інтарэсы, дзяржава працягвае выконваць сацыяльныя абавязацельствы перад сваімі грамадзянамі.

### Аптымальны ўзровень і спрошчаны парадак

Карэкціроўка Падатковага кодэкса прадугледжвае сістэмныя меры па ўдасканаленні падатковага заканадаўства. Прадугледжана дасягненне аптымальнага ўзроўню падатковай нагрузкі на эканоміку, далейшае спрашчэнне парадку вылічэння і выплаты канкрэтных падаткаў.

Пры дапрацоўцы законапраекта да другога чытання былі ўлічаны прапановы дзяржаўных органаў. У прыватнасці, адна з іх звязана з павелічэннем крытэрыю выручкі для прымянення спрошчанай сістэмы падаткаабкладання да 3,5 мільёна рублёў. Прапанова Міністэрства транспарту звязана з прымяненнем нулявой стаўкі падатку на дабаўленую вартасць па паслугах па міжнароднай аўтамабільнай перавозцы грузаў у частцы маршруту, якая пачынаецца і заканчваецца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Па словах **члена Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Наталлі КУЛЯШОВАЙ,** змяненні, якія ўносяцца ў Падатковы кодэкс, датычацца практычна ўсіх падаткаў і спецыяльных рэжымаў падаткаабкладання. «Пры дапрацоўцы да другога чытання ў законапраекце ўлічаны прапановы і пажаданні юрыдычных асоб, бізнес-супольнасці, — удакладніла дэпутат. — Яны знайшлі адлюстраванне ў змяненні крытэрыяў выручкі па спрошчанай сістэме падаткаабкладання і льготах пры вылічэнні падатку на дабаўленую вартасць».

Парламентарый заўважыла, што па-ранейшаму будуць дзейнічаць павышаныя стаўкі па падатку на прыбытак у памеры 25 %. «Устанаўліваецца павышаная стаўка для аператараў сотавай сувязі і арганізацый, мікраарганізацый, якія займаюцца мікрапазыкамі, — дадала Наталля Куляшова. — У Падатковы кодэкс уносіцца асобны артыкул, які датычыцца падаткаабкладання падаходным падаткам аперацый з лічбавымі знакамі — токенамі. Падатковы падатак не плаціцца, калі аперацыя з токенамі будзе праводзіцца праз рэзідэнтаў Парка высокіх тэхналогій».

Па словах дэпутата, унесеныя змяненні і карэкціроўкі ў Падатковы кодэкс накіраваны на эфектыўнае эканамічнае развіццё нашай краіны і забеспячэнне даходнай часткі бюджэту.

**Вераніка КАНЮТА.**

## Сядзі і глядзі

# Лёс фіналістаў «Фактар.by» — у вашых руках

**Ужо сёння ўвечары ў 20.45 тэлеканал «Беларусь 1» распачынае прамыя эфіры шоу «Фактар.by». І цяпер лёс фіналістаў праекта ўжо па традыцыі будуць вырашаць тэлегледачы. Далучайцеся да тэлефоннага галасавання ў прамым эфіры.**

На працягу сямі тыдняў у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» і на афіцыйным youtube-канале прыхільнікі з усяго свету сачылі за гісторыямі ўдзельнікаў чацвёртага сезона шоу «Фактар.by». Напружанне ў вакальнай барацьбе за месцы ў камандах настаўнікаў не зніжалася да апошняй хвіліны. І цяпер на сцэне праекта стане яшчэ гарачэй. Таму што пачнецца самы непрадказальны і эмацыянальны этап праекта, фінал якога будзе залежаць ад рашэння тэлегледачоў, з васьмі прамых эфіраў, жывых канцэртаў.

Трэніравацца і «запальваць» у камандзе тэледзівы Вольгі Бузавай будуць Віталь Багданаў, Дзмітрый Лашкароў і Самір Елчыеў. У каманду да шоумена Стаса Ярушына трапілі Кацярына Кузіна, Дзіяна Лугіна і Вахтанг Гелашвілі. Скарадь сэрцы прыхільнікаў праекта разам з музыкантам і спеваком Дзянісам Кляверам працягнуць Марыя Ашурык, Арына Пехцерава і Дзяніс Прымак. А ў тройку народнага артыста Беларусі Уладзіміра Громава трапілі Таццяна Сыцік, Мілана Якімовіч і Юлія Юхневіч.




Не прапусціце першы прамы эфір у пятніцу, 6 снежня, у 20.45 на тэлеканале «Беларусь 1», а галоўнае, помніце, што адразу пасля выступленняў усіх фіналістаў адкрыюцца слоты для тэлефоннага галасавання. Пазнаёміцца бліжэй з галоўнымі героямі «Фактар.by» ёсць магчымасць у Instagram @factor.by, а таксама ў дзённіках праекта.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 212

**У XXII камандным чэмпіянаце Расіі па складанні шахматных кампазіцый узялі ўдзел дзве запрошаныя беларускія каманды. Тры прызавыя месцы занялі адпаведна Маскоўская вобласць — 1, Маскоўская вобласць — 2 і Масква.**

Адразу за прызавой тройкай размясцілася каманда «ГроМ» (Гродзенская і Магілёўская вобласці; Міхаіл Храмцэвіч — капітан, Віктар Волчак, Вячаслаў Красічонак). У дзясятку найлепшых у сваіх раздзелах трапілі 9 з 12 кампазіцый гэтай каманды. Прычым тры задачы падзялілі прызавыя месцы ў раздзелах.

Каманда Брэсцкай вобласці (Вадзім Жылко — капітан, Іван Бондар, Мікалай Быкаў, Аляксандр Варыцкі) заняла выніковае дзясятае месца.

* * *

Для самастойнага рашэння прапануем задачу М. Храмцэвіча, якая заняла ў раздзеле двухходовак сёмае месца (*гл. дыяграму*).

**Белыя:** Кра1, Фg2, Лс5, Сh6, Сh7, Ка4, Кf7, пп. b3, c2, d3 (10).

**Чорныя:** Kpd4, Лd7, Сf5, Сg1, Ке8, пп. b4, e4, h2 (8).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru




* * *

Дзве наступныя задачы склалі сумесна М. Храмцэвіч, В. Волчак і В. Красічонак. Кампазіцыі падзялілі 3—4-е месцы ў раздзеле трохходовак.

**№ 1**

**Белыя:** Кра7, Фg4, Са6, Kh5, пп. b4, c6, d2 (7).

**Чорныя:** Kpd5, Лh8, Kg8, пп. d6, e4, e5, h7 (7).

Мат за 3 хады.

Не вядзе да мэты 1. Cf1? (цугцванг) 1...Кр:с6 2. Фс8+ Kpd5 3. Фс4х; 1...Kpd4 2. Фе2 ~ 3. Фс4х, 2...d5 3. Фе3х; 1...К~ 2. Kf6+ Кр:с6 3. Фd7х, 2...Kpd4 3. Ф:е4х, але 1...h6! Рашае 1. Ф5! ~ 2. Ф7+ Кр:с6 3. Фb7х, 2...Kpd4 3. Фс4х; 1...е3 2. Kf4+ Кр:с6 3. Фс8х, 2...Kpd4 3. Фd3х; 1...К~ 2. Kf6+ Кр:с6 3. Фd7х, 2...Kpd4 3. Ф:е4х; 1...Кр:с6 2. Фс8+ Kpd5 3. Фс4х, 1...Kpd4 2. Фf1 ~ 3. Фс4х, 2...d5 3. Фа1х

**№ 2**

**Белыя:** Kpb1, Фс7, Лb3, Cd3, Се1, Ке2, Ке8, пп. c2, e5, f5 (10).

**Чорныя:** Kpd5, Лb8, Ch2, Ка2, Kb7, пп. а6, c3, c6, d6, e6 (10).

Мат за 3 хады.

Рашае 1. Лb4! ~ 2. Се4+ Kpc5 3. Фb6х, 2...Кр:е5 3. Фg7х; 1...К:b4 2. Kf6+ Kpc5 3. Cf2х, 2...Кр:е5 3. С:с3х; 1...ef 2. Ф7+ Kpc5 3. Фс4х, 2...Кр:е5 3. Ф:f5х; 1...Kpc5 2. Фb6+ Kpd5 3. Фd4х; 1...Кр:е5 2. Фg7+ Kpd5 3. Фd4х

* * *

Беларуская федэрацыя шахмат правяла другі анлайн-турнір па хуткіх шахматах. Прызавую тройку склалі майстар FIDE Міхей Навуменка, гросмайстры Аляксей Аляксандраў і Сяргей Жыгалка.

Аляксей Фёдараў паспяхова выступіў на турнірах у Казахстане: у Кызыл-Ардзе заняў першае месца (4 перамогі і 5 нічыіх), а ў Шымкенце — чацвёртае. Міхаіл Нікіценка заваяваў «бронзу» на Кубку Казахстана ў Алматы.

На чэмпіянаце Еўропы сярод шахматыстаў з абмежаванымі магчымасцямі Міхаіл Дзенісеня заняў другое месца, а ў бліцы — трэцяе.

* * *

**Задача з мінулага выпуску рашаецца:** 1. Ке6! Правільна адказалі Іван Бондар, Ігар Ананіч, Васіль Жуковіч, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цыльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## З нагоды

# ЗБЕРАГЧЫ ДАДЗЕНАЕ ЗВЫШ ДАРАВАННЕ

**Можна смела сцвярджаць, што гэту актрысу ведаюць усе. У яе фільмаграфіі — кінапрацы «Службовы раман», «Сталкер», «Саламяны капялюшык», «Жорсткі раманс», «Жаночая логіка» і многія іншыя. У кожнай артыстка па-асабліваму запамінальная і абаяльная. І сёлета народная артыстка СССР Аліса Фрэйндліх адзначыць сваё 90-годдзе. Вядома, у святочны дзень 8 снежня не абыдзецца без сустрэч з любімай артысткай на тэлеэкране.**



Фота з адкрытых крыніц.

Так, на сацыякультурным тэлеканале гледачоў чакае паказ мастацкай кінастужкі «Жорсткі раманс» рэжысёра Эльдара Разанава, якая, дарэчы, убачыла свет сорак гадоў таму, у 1984-м. Двухсерыйны фільм, які лічыцца адной з найлепшых экранізацый п'есы Аляксандра Астроўскага «Беспасажніца», цікава глядзець і праз гады. Бо кожны раз можаш знаходзіць у ім новыя сэнсы, адценні пачуццяў герояў і ўсведамляць, што сапраўдная класіка заўсёды па-за часам.

Натурныя здымкі кінастужкі праходзілі ў асноўным у Кастраме. Аператарам стаў Вадзім Алісаў, з якім Эльдар Разанаў раней ужо працаваў над фільмам «Вакзал для дваіх». Сама дзея разгортваецца ў правінцыйным горадзе Брахімаве. Як успамінаў пасля рэжысёр, прататыпам гэтага горада мог бы быць Яраслаўль ці Ніжні Ноўгарад. І ў пачатку цітраў мы бачым Волжскую набярэжную ў Яраслаўлі. І серыі маюць храналагічныя адрозненні: у першай мы назіраем падзеі на працягу года, а ў другой — кульмінацыю і развязку. Ролю збяднелай дваранкі Харыты Ігнацьеўны Агудалавай якраз і ўвасабляе на экране Аліса Фрэйндліх... Сам фільм пасля выхаду быў неадназначна сустрэты супольнасцю крытыкаў. Напрыклад, адным з аб'ектаў для нападак стала акцёрская ігра пачынаючай актрысы Ларысы Гузеевай, якая, на думку рэцэнзентаў, згубілася на фоне Міхалкова і Фрэйндліх. А негатыўная ацэнка кінастужкі на тэлебачанні ў 1984 годзе Зіновія Герта паставіла кропку ў сяброўстве апошняга з Разанавым. Праўда, былі і тыя, хто не згаджаўся з крытыкамі карціны. У прыватнасці, у газеце «Савецкая культура» Андрэй Чэгадаеў звярнуў увагу на тое, што звычайна абмяркоўваецца ў рэцэнзіях рэжысёрскае прачытанне літаратурнай асновы, прычым не на карысць самога рэжысёра: «Цудоўны, на мой погляд, фільм — фільм, які незвычайна тонка і глыбока раскрывае вобразную і ідэйную будову цудоўнага твора драматурга. Няма іншага фільма, на мой погляд, больш блізкага да Астроўскага, а крытыкі, якія, паводле іх меркавання, валодаюць абсалютнай ісцінай, раз'юшана накінуліся на карціну без найменшых на тое падстаў». І таксама неадназначнае ўспрыманне экранізацыі класікі — як мінімум таксама адна з прычын для яе прагляду сёння. Не прапусціце кінасеанс на «Беларусь 3».

У эфіры тэлеканала «Расія-Культура» ў нядзелю пакажуць фільм Яўгена Хрынюка «Ганна і камандор», зняты паўстагоддзя таму ў 1974 годзе. Паводле сюжэта, гераіня Алісы Фрэйндліх распавядае драматургу пра свайго мужа (Васіль Ланавой), які быў вучоным і загінуў. Мы назіраем у кадры гісторыю кахання, сямейнага жыцця, дзе ёсць месца светлым пачуццям, стратам і знаходкам. Нахлынулыя ўспаміны дапамагаюць Ганне зразумець, што «гісторыя кахання працягваецца, пакуль з двух закаханых хоць бы адзін жывы...» Кранальную кінагісторыю глядзіце ў дзённым эфіры.

А ўвечары прыхільнікаў творчасці артысткі чакае паказ дакументальнага фільма «Людзі і страсці Алісы Фрэйндліх». «Чым даўжэй чалавек захоўвае ў сабе дзяцінства, тым даўжэй беражэ дадзены Богам дар», — лічыць актрыса тэатра і кіно, народная артыстка Аліса Фрэйндліх. У кадры тэлегледачоў чакае аповед пра не няпростае блакаднае дзяцінства, пра бязмежны дар Вялікай Актрысы, пра сям'ю, каханне, блізкіх людзей, родныя мясціны, а таксама пра рэлігію, яе рэжысёраў жыцця, пра страты і знаходкі, увасобленыя і пакуль яшчэ не сыграныя ролі і, вядома, пра простае жаночае шчасце.

Адразу пасля гэтага можна будзе ўбачыць артыстку на экране ў спектаклі Тэатра імя Ленсавета «Утаймаванне свавольнай» па аднайменнай камедыі Шэкспіра. А значыць, нас ізноў чакае класічны сюжэт, вір пачуццяў і выдатная ігра любімых акцёраў.

**Алена ДРАПКО.**


## «Чытаць з намі — утульна!»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» ці на газету «Літаратура і мастацтва» на I квартал або на I паўгоддзе 2025 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце яе і дасылайце да 22 студзеня 2025 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Сярод падпісчыкаў будуць разыграны сем канвектараў Edisson Polo 1500 M і суперпрыз — масляны радыятар Neoclima NC 9309. Віннікі будуць апублікаваны ў газеце да 5 лютага 2025 года.





Прызы можна будзе атрымаць да 31 сакавіка 2025 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» або «Літаратуру і мастацтва» на I квартал ці на I паўгоддзе 2025 года. Пасля 31 сакавіка 2025 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ад падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні чытайце ў «Звяздзе» ад 29 лістапада 2025 года, № 233.

**Тэлефоны для даведак: (017) 271-81-53, 311-17-40.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4265 ад 1.12.2022 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» або «ЛіМа» на I квартал або на I паўгоддзе 2025 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

____________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ____________________

(аддзяленне сувязі)

на I квартал або на I паўгоддзе 2025 года

Хатні адрас і тэлефон (абавязкова) ________ (індэкс) ________

____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!

## Беларусь 1

**6.20 Меладрама «Там, дзе нас няма» (16+).**
**8.05** Існасць.
**8.30** Сэнс жыцця (12+).
**9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**9.20** «Добрай раніцы, Беларусь!» (12+)
**10.10** Здароўе (12+).
**11.00** «Маршрут пабудаваны» (12+).
**11.30 «За паству і Айчыну». Тэлефільм (12+).**
**12.20** Зона Х. Вынікі тыдня (16+).
**12.55, 23.20 Меладрама «Упушчанае шчасце» (16+).**
**15.20** Краіна.
**15.50** Адзін дзень (12+).
**16.20** Тайны следства (12+).
**16.50, 19.10 Меладрама «Анюціны вочкі» (16+).**
